ЗАЦВЯРДЖАЮ

Начальнік аддзела культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта

Т.М. Ражэва

ІНСТРУКЦЫЯ

аб парадку арганізацыі і правядзенні конкурсу выканаўцаў парных побытавых танцаў у межах фестывалю побытавых танцаў "Жодзішкаўскі карагод"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу выканаўцаў парных побытавых танцаў (далей – Конкурс) ў межах фестывалю побытавых танцаў "Жодзішкаўскі карагод".

2. Конкурс праводзіцца з мэтамі захавання, аднаўлення і пераемнасці традыцыйнага танцавальнага мастацтва Беларусі і ставіць перад сабой наступныя задачы:

выхаванне ў падрастаючага пакалення патрыятычных пачуццяў, умацаванне нацыянальнай самасвядомасці, адметнасці праз аўтэнтычны танец, музыку, народны этыкет, касцюм;

далучэнне насельніцтва да нацыянальнай культурнай спадчыны;

практычнае засваенне мясцовых узораў танцавальнай традыцыі;

папулярызацыя і перадача нашчадкам традыцыйнага танцавальнага фальклору;

павышэнне сацыяльнага рэйтынгу носьбітаў культурнай спадчыны.

3. Арганізатарамі Конкурсу з'яўляюцца: аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".

4. Конкурс праводзіцца 28.06.2026 на базе філіяла "Жодзішкаўскі Дом культуры" дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" (вул. Першамайская, 2б, аг. Жодзішкі, Смаргонскі раён).

5. У Конкурсе ўдзельнічаюць асобы, якія займаюцца мастацкай творчасцю на непрафесійнай аснове: дзіцяча-юнацкія танцавальныя пары, моладзь, дарослыя, носьбіты танцавальнага фальклору.

6. У Конкурсе вызначаюцца тры ўзроставыя катэгорыі: А (5-10 год), Б (11-17 год), В (18+).

7. Удзельнікі Конкурсу прадстаўляюць варыянты (з захаваннем мясцовага адметнага выканальніцкага стылю) праграмных танцаў:

катэгорыя А: "Карэлафінская", "Яблычка", "Мальвіна", "Нарэчанька";

катэгорыя Б: "Какетка", "Верабей", "Ойра";

катэгорыя B: “Субота”, “Каробачка”, “Матлёт”, “Ночка”.

8. Пераможцаў Конкурсу вызначае журы (дадатак 1). У кожнай узроставай катэгоры і вызначаецца лаўрэт I, II, III ступені, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі прызамі.

9. Журы пакідае за сабой права ў межах агульнага прызавога фонду аб’ядноўваць, дзяліць прызавыя месцы (акрамя першага) паміж удзельнікамі розных узроставых катэгорый.

10. Выступленні ацэньваюцца журы па 10-бальнай сістэме, пры закрытым судзействе па наступных крытэрыях:

веданне кампазіцыі танца;

музыкальнасць выканання;

захаванне мясцовага танцавальнага стылю;

самабытнасць і адметнасць танцавальнай манеры;

адпаведнасць касцюмаў мясцовым традыцыям;

сцэнічная культура, этыкет.

11. Заяўка на ўдзел у Конкурсе (дадатак 2) дасылаецца ў ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры” з паметкай “Жодзішкаўскі карагод” да 15.06.2026 на электронную пошту met.otd@rck.by. Кантактны тэлефон: +375(1592)37314.

Дадатак 1

да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу выканаўцаў парных побытавых танцаў у межах фестывалю побытавых танцаў "Жодзішкаўскі карагод"

СКЛАД ЖУРЫ
конкурсу выканаўцаў парных побытавых танцаў у межах фестывалю побытавых танцаў "Жодзішкаўскі карагод"

| | |
|---|---|
| Гумінская А.В. | вядучы спецыяліст ІПКіПК БДУКМ; |
| Зеновіч Т.В. | загадчык філіяла "Раённы Дом рамёстваў" ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Каліноўская А.Т. | выкладчык школы традыцыйнага мастацтва, кіраўнік фальклорнага клуба "Мінская кадрыля"; |
| Козенка М.А. | этнахарэограф, *старшыня журы*; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 1

да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу выканаўцаў парных побытавых танцаў у межах фестывалю побытавых танцаў “Жодзішкаўскі карагод”

# ЗАЯЎКА
на ўдзел у конкурсе выканаўцаў парных побытавых танцаў у межах фестывалю побытавых танцаў “Жодзішкаўскі карагод”

| № п/п | Прозвішча, імя, імя па бацьку выканаўцаў | Назва ўстановы, якая прадстаўляе танцавальную пару | Даты нараджэння ўдзельнікаў | Катэгорыя |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |